Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 284 (353) СЕРАДА 11 СНЕЖНЯ 1940 г.

Цана 10 капеек.

15 снежня 1940 г.—выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Грамадзяне і грамадзянкі! Усе як адзін з'явімся да выбарчых урнаў і аднадушна будзем галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных!

ДЭПУТАТ -- СЛУГА НАРОДА

11 снежня 1937 года вялікі совецкі народ з радасцю і лікаваннем сустракаў надыходзячыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР. Ва ўсіх рэспубліках першым кандыдатам быў аднадушна вылучан вялікі правадыр народаў таварыш Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі. І вось напярэдадні дня выбараў 11 снежня 1937 года ўсенародны кандыдат у дэпутаты таварыш Сталін выступіў з гістарычнай прамовай на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы. Прамову таварыша Сталіна з затоеным дыханнем слухала па радыё ўся совецкая краіна.

Таварыш Сталін у сваёй прамове з вычарпальнай паўнатой і яснасцю напомніў выбраннікам народа, якую адказнасць яны нясуць перад народам, перад сваімі выбаршчыкамі. Таварыш Сталін гаварыў аб тых вялікіх патрабаваннях, якія выбаршчыкі павінны прад'яўляць сваім выбраннікам. Таварыш Сталін указаў, як процілеглы адносіны паміж дэпутатам і народам у капіталістычных краінах і на агульнасць інтарэсаў дэпутатаў і народа ў нашай соцыялістычнай дзяржаве.

«Калі ўзяць капіталістычныя краіны,—гаворыць таварыш Сталін,—то там паміж дэпутатам і выбаршчыкамі існуюць некаторыя своеасаблівыя, я сказаў-бы, даволі дзіўныя адносіны. Пакуль ідуць выбары, дэпутаты заігрываюць з выбаршчыкамі, лісліваць перад імі, клянуцца ў вернасці, даюць кучу ўсякіх абяцанняў. Выходзіць, што залежнасць дэпутатаў ад выбаршчыкаў поўная. Як толькі выбары адбыліся і кандыдаты ператварыліся ў дэпутатаў, адносіны мяняюцца ў корані. Замест залежнасці дэпутатаў ад выбаршчыкаў, атрымліваецца поўная іх незалежнасць. На працягу 4-х або 5-ці год, гэта значыць аж да новых выбараў, дэпутат адчувае сябе зусім свабодным, незалежным ад народа, ад сваіх выбаршчыкаў. Ён можа перайсці з аднаго лагера ў другі, ён можа звярнуць з правільнай дарогі на няправільную, ён можа нават заблытацца ў некаторых махінацыях не зусім патрэбнага характару, ён можа кувыркацца, як яму ўгодна— ён незалежны.

Ці можна лічыць такія адносіны нармальнымі? Ні ў якім выпадку, таварышы. Гэтую акалічнасць улічыла наша Канстытуцыя і яна правяла закон, у сілу якога выбаршчыкі маюць права датэрмінова адклікаць сваіх дэпутатаў, калі яны пачынаюць фінціць, калі яны зварачваюць з дарогі, калі яны забываюць аб сваёй залежнасці ад народа, ад выбаршчыкаў».

Нашы выбаршчыкі добра памятаюць, як праходзілі выбары ў панскай Польшчы. Дэпутаты, якія былі сілай навязаны выбаршчыкам, са скуры лезлі вон, каб прыкінуцца прыяцелямі народа. Яны не былі скупыя на абяцанні, яны ішлі на подкуп, спойвалі асобных выбаршчыкаў, каб толькі прабрацца ва ўпраўленне дзяржавай. Пасля выбараў яны не толькі не думалі аб сваіх выбаршчыках, аб выкананні сваіх абавязкаў, але прадаўжалі палітыку прыгнечання і заняволення народных мас.

Характэрна ў сувязі з гэтым прывесці пісьмо сялян вёскі Драгачэва, Ломжынскага павета, адрасаванае ў міністэрства ўнутраных спраў ад 3 лютага 1928 года:

«Мы, жыхары вышэй указанай вёскі,—гаворыцца ў пісьме,—звяртаемся з просьбай да пана міністра растлумачыць нам, бедным і несвядомым сялянам, як і за які спісак мы павінны галасаваць, каб наша зямля расла і развівалася і каб, нарэшце, запанавала сапраўдная дэмакратыя. Мы—народ—ужо некалькі разоў былі абмануты, таму не жадаем быць абманутымі ў трэці раз».

Пілсудчыкі з міністэрства адказалі сялянам, што трэба, моў, галасаваць за спісак № 1, гэта значыць за пілсудчыкаў, тады, моў, і зямля будзе, і дэмакратыя запануе. Сяляне, як і ўсе працоўныя, пераканаліся, што і пілсудчыкі, і пэпэсаўцы, і партыя «Строніцтво людове», і ўсе іншыя контррэволюцыйныя партыі ашуквалі народ. Вось чаму на апошніх выбарах у сейм палова насельніцтва не ішла да выбарчых урнаў.

Зараз свабодным грамадзянам заходніх абласцей ясна, за каго трэба галасаваць. Усе кандыдаты ў мясцовыя Советы вылучаны самім народам, яны будуць да канца абараняць інтарэсы народа. Наша большэвіцкая партыя, наша совецкая ўлада не на словах, а на справе дала сялянам зямлю, фабрыкі і заводы сталі здабыткам народа, у нас пануе сапраўдная сталінская дэмакратыя. Вось чаму на прадстаячых 15 снежня выбарах у мясцовыя Советы выбаршчыкі ўсе як адзін будуць галасаваць за партыю Леніна—Сталіна, за сваіх народных кандыдатаў.

Якімі павінны быць нашы дэпутаты? Аб гэтым выключна ярка ўказаў у сваёй прамове таварыш Сталін:

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны аставаліся на вышыні сваіх задач; каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацеляў; каб яны аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу; каб яны былі такімі-ж яснымі і акрэсленымі дзеячамі, як Ленін; каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін; каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі таксама-ж свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі таксама-ж мудрыя і непаспешлівы пры рашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін; каб яны былі таксама-ж праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін; каб яны таксама любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

У вобразе Леніна і Сталіна народ бачыць такіх дзеячоў, бачыць прыклад, якому трэба следаваць. Нашы кандыдаты павінны ісці па шляху, указанаму Леніным і Сталіным; быць да канца жыцця верным свайму народу.

Праз чатыры дні народы заходніх абласцей БССР і Украіны пойдуць да выбарчых урнаў выбіраць дэпутатаў у мясцовыя органы совецкай улады. Аднадушна галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, яны тым самым будуць галасаваць за палітыку партыі Леніна—Сталіна, за свой родны рабоча-сялянскі ўрад, за сваё свабоднае, шчаслівае жыццё.

ВЕЛІЗАРНЫ ПАЛІТЫЧНЫ ЎЗДЫМ

ЧЭРНАВІЦЫ, 10 снежня. (ТАСС). У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС сакратар Чэрнавіцкага абкома партыі тав. Грушэцкі расказаў аб ходзе выбарчай кампаніі ў вобласці:

У Паўночнай Букавіне, дзе толькі 5 месяцаў назад устаноўлена совецкая улада, з нябачаным палітычным уздымам праходзіць выбарчая кампанія па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і УССР. Насельніцтва Чэрнавіцкай вобласці далучылася да актыўнага палітычнага жыцця. Да выбараў рыхтуюцца паўсямесна, аж-да самых аддалёных куткоў, такіх як Пуцільскі раён, сяленні якога раскінуліся ў Карпацкіх гарах. У гэту «глухамань», дзе народ пры ўладарстве румынскіх баяр не бачыў газет, не ведаў, што такое словак і кніга, пранікл і словы ўсеперамагаючай сталінскай праўды.

На тысячах перадвыбарчых сходаў народ вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты сваіх лепшых, дастойнейшых прадстаўнікоў: украінца Нікалая Паўлюка—селяніна сяла Задуброўка, румына Луку Ласобукавінскага—рабочага, украінку-сялянку Домну Гешко. Як і многія іншыя, яны ў цяжкія годы разгула румынскай баяршчыны змагаліся за шчасце народа, якое прынесла цяпер у Паўночную Букавіну совецкая ўлада.

Чаго мы дабіліся ў спаборніцтве з беластоцкімі тэкстыльшчыкамі

(Пісьмо з Масквы)

Роўна год назад прадстаўнікі Трохгорнай мануфактуры імені Дзержынскага падпісалі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з тэкстыльшчыкамі Беластока. З друку і з матэрыялаў нядаўна праведзенай радыёпераклічкі мы ведаем, што беластачане дабіліся на працягу года вялікіх поспехаў. К 1 лістапада ў Беластоку спаборнічалі 57 процантаў працуючых тэкстыльшчыкаў. Многія перадавыя прадпрыемствы паспяхова выканалі свой план. Нам вядома таксама, што ранейшых прадпрыемстваў цяпер не пазнаць. За год праведзена грандыёзная работа па іх рэканструкцыі.

Вялікія змяненні адбыліся і ў нас на камбінаце Трохгорнай мануфактуры. Соцыялістычны дагавор з тэкстыльшчыкамі беластоцкіх камбінатаў № 1 і № 2 адыграў вялікую ролю ў нашых поспехах.

За час пасля падпісання дагавора соцыялістычнае спаборніцтва ў нас набыло нябачаны размах. Калі да 1 студзеня 1940 года з 5.163 чалавек у спаборніцтве ўдзельнічала 82,5 процанта, то да 1 кастрычніка 1940 года соцспаборніцтвам ахоплены ўсе рабочыя. На камбінаце налічваецца 2.446 стаханаўцаў. што складае палову калектыва. Большасць рабочых вядучых прафесій абслугоўваюць большую колькасць машын, чым гэта прадугледжана планам.

Мерапрыемствы ў сувязі з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня нам дазволілі ўзяць на сябе абавязацельства выканаць гадавы план не да 12 снежня 1940 года, як гэта было запісана ў дагаворы з беластачанамі, а да 1-га снежня.

І вось вынік: гадавы план па прадзенню і ткацтву камбінат выканаў 27 лістапада. Выпушчана 1.530 тыс. тон пражы і 19.669 тыс. метраў сураўя. Да 1-га студзеня 1941 года мы разлічваем даць дадаткова 168 тон пражы, 2.100 тыс. метраў сураўя і 8.775 тыс. метраў гатовых тканін.

Калектыў Трохгорнай мануфактуры выканаў свае абавязацельствы і па якасці прадукцыі. У мінулым годзе мы выпусцілі 11,1 проц. сураўя другім сортам. У гэтым годзе другі сорт быў запланіраван не вышэй 6 процантаў. Фактычна другі сорт склаў 3,72 процанта. Значна знізіўся брак. Калі ў мінулым годзе брак сураўя складаў 2,31 процанта, то ў гэтым годзе — толькі 1,01 процанта.

І яшчэ можна назваць адзін высокі паказчык, якога дабіўся калектыў стаханаўскай работай: сабекошт прадукцыі ў нас на 0,88 процанта ніжэй плана, у выніку чаго дзяржава атрымала 2.607 тысяч рублёў эканоміі.

У абавязацельствах, якія мы на сябе ўзялі, вялікае месца адводзілася падрыхтоўцы кадраў. І гэтыя пункты дагавора намі выкананы. У школе стаханаўцаў навучаецца 115 рабочых і 26 ужо закончылі абучэнне. 420 рабочых здалі экзамены па тэхмінімуму, 300 чалавек прайшлі школы стаханаўскага вопыту, 28 чалавек падрыхтаваны на курсах па праграме тэхнікума, 23 чалавекі атрымалі веды ў аб'ёме тэкстыльнай вышэйшай навучальнай установы, 8 чалавек працуюць у аспірантуры без адрыву ад вытворчасці, 24 рабочых рыхтуюцца стаць памочнікамі майстраў.

На камбінаце нямала зроблена па паляпшэнню культурна-бытавога абслугоўвання рабочых. У нас ёсць клуб, тэатр, дзіцячы дом культуры. У гэтым годзе ў санаторыях і на курортах лячылася 118 стаханаўцаў. У двухтыднёвых дамах адпачынку пабывала 876 чалавек. Летам дзеці рабочых знаходзіліся на дачы ў жывапіснай падмаскоўнай мясцовасці Салтыкоўцы. У яслях выхоўваецца 255 дзяцей, адкрыты новыя яслі на 120. Гэтым мы задаволілі ўсе патрабаванні мацярэй-работніц. На рамонт рабочых кватэр было выдаткавана звыш 500 тысяч рублёў.

У спаборніцтве з беластоцкімі тэкстыльшчыкамі мы дасягнулі немалых поспехаў. Але — мы не павінны супакойвацца, а будзем працаваць так, каб выціснуць з тэхнікі ўсе магчымасці і даць краіне яшчэ больш дабротных і прыгожых тканін. Да гэтага мы і заклікаем вас, таварышы тэкстыльшчыкі Беластока!

А. САЛАМАЦІНА,
сакратар парткома камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Дзержынскага.

РАГАТКІН,
старшыня фабкома камбіната Трохгорнай мануфактуры імені Дзержынскага.



Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі

Трэст будаўнічых матэрыялаў выканаў гадавы план

Сярод рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў разгарнулася дзейная падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэту дату калектывы прадпрыемстваў імкнуцца сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Калектыў рабочых прамысловасці будматэрыялаў датэрмінова выканаў гадавы план на 105,4 процанта, у тым ліку па цэгле—на 100 процантаў, ізразцах—120,9 процанта.

Здабыта 9,5 тысяч тон торфу, 3,5 тоны мастацкіх вырабаў, 696,5 тысяч тон вапны.

Абавязуемся даць звыш плана 660 тысяч штук цэглы абжыгу, 450 тысяч адзінак ізразцоў.

В. Драпкін,
упраўляючы трэста будматэрыялаў.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных сярод калектыва 2-га тэкстыльнага камбіната. Значна ўзрасла выпрацоўка апаратна-прадзільнага цэха. План лістапада па пражы выканан на 109 процантаў. Пасля праведзенага грамадскага агляду абсталявання палепшыўся догляд за станкамі.

У азнаменаванне дня Сталінскай Канстытуцыі рабочыя 1, 2 і 3 корпусаў 4 снежня сталі на стаханаўскую вахту. Многія стаханаўцы дабіліся выдатных паказчыкаў. Так, напрыклад, вінтаўшчыца тав. Бакс выканала дзённае заданне на 139,8 процанта, стаханаўка Лубінская—на 138,5 процанта, змена старшага майстра—на 121,1 процанта.

Дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных калектыў рабочых сустрэне новымі вытворчымі **перамогамі.**

У. Уколаў.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

205. Па акрузе **№ 192** зарэгістрыраван Георгій Васільевіч **Варабей,** 1921 г. нараджэння, член ВЛКСМ, аглядчык вагонаў, вылучаны калектывам вагоннага ўчастка **Беластоцкай чыгункі.**

206. Па акрузе **№ 194** зарэгістрыраван Павел Іванавіч **Касьяновіч,** 1897 г. нараджэння, беспартыйны, паравозны машыніст Беластоцкага дэпо, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых паравознага дэпо ст. Беласток.

207. Па акрузе **№ 195** зарэгістрыравана Аляксандра Дзянісаўна **Шакальская,** 1912 года нараджэння, кандыдат ВКП(б), начальнік Беластоцкага паравознага дэпо, вылучаная калектывам гэтага-ж дэпо.

208. Па акрузе **№ 199** зарэгістрыраван **Максім Танк** (Еўгеній Іванавіч Скурко), 1912 г. нараджэння, беспартыйны, беларускі паэт, вылучаны агульным сходам пісьменнікаў.

209. Па акрузе **№ 200** зарэгістрыраван Аляксей Пятровіч **Лебедзеў,** 1902 г. нараджэння, член ВКП(б), начальнік 4-га гарадскога аддзялення міліцыі, вылучаны калектывам тэкстыльнай фабрыкі № 20.

210. Па акрузе **№ 201** зарэгістрыраван Мар'ян Антонавіч **Райнер,** 1898 г. нараджэння, беспартыйны, сакратар фабкома 25-й фабрыкі, вылучаны калектывам гэтай-жа фабрыкі.

211. Па акрузе **№ 203** зарэгістрыраван Іван Іванавіч **Купцоў,** 1895 г. нараджэння, член ВКП(б), дырэктар гартопа, вылучаны калектывам кандзіцерска-макароннага камбіната і базы «Белкандзіцер».

212. Па акрузе **№ 204** зарэгістрыраван Канстанцін Фёдаравіч **Арцюшэўскі,** 1910 г. нараджэння, беспартыйны, майстар-брыгадзір лесазавода № 2, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых лесапільнага завода № 2.

213. Па акрузе **№ 206** зарэгістрыраван Балеслаў Ігнацьевіч **Кісель,** 1896 г. нараджэння, беспартыйны, фармаўшчык глазурна-ізразцовага завода № 16, вылучаны калектывам гэтага-ж завода.

214. Па акрузе **№ 207** зарэгістрыравана Анна Лук'янаўна **Якаўчук,** 1919 г. нараджэння, беспартыйная, работніца каўбаснага цэха мясакамбіната, вылучаная рабочымі і служачымі гэтага-ж камбіната.

215. Па акрузе **№ 208** зарэгістрыраван Георгій Лаўрэнцьевіч **Жэлезнікаў,** 1902 г. нараджэння, член ВКП(б), начальнік Беластоцкай раённай канторы сувязі, вылучаны калектывам раённай канторы сувязі.

216. Па акрузе **№ 211** зарэгістрыравана Елізавета Парфір'еўна **Клімюк,** 1898 г. нараджэння, беспартыйная, загадчык дзіцячага сада № 4, вылучаная агульным сходам работнікаў дзіцячых садоў і дзіцячых дамоў гор. Беластока.

217. Па акрузе **№ 212** зарэгістрыраван Сяргей Аляксандравіч **Волкаў,** 1904 г. нараджэння, член ВКП(б), начальнік палітаддзела Беластоцкай чыгункі, вылучаны агульным сходам супрацоўнікаў чыгункі.

218. Па акрузе **№ 214** зарэгістрыравана Елізавета Ізраілеўна **Крывіцкая,** 1912 г. нараджэння, член ВЛКСМ, начальнік аддзела рамонта вагонаў Беластоцкай чыгункі, вылучаная агульным сходам супрацоўнікаў упраўлення Беластоцкай чыгункі.

219. Па акрузе **№ 215** зарэгістрыравана Марыя Адамаўна **Сеўрук,** 1894 г. нараджэння, беспартыйная, хатняя гаспадыня, член праўлення клуба чыгуначнікаў, вылучаная агульным сходам супрацоўнікаў упраўлення Беластоцкай чыгункі.

220. Па акрузе **№ 216** зарэгістрыраван Саламон Захаравіч **Блінкоў,** 1906 г. нараджэння, член ВКП(б), старшыня Дорпрофсожа, Беластоцкай чыгункі, вылучаны агульным сходам супрацоўнікаў упраўлення чыгункі.

221. Па акрузе **№ 217** зарэгістрыравана Елена Владзіміраўна **Арніна,** 1894 г. нараджэння, беспартыйная, настаўніца 8-й школы, вылучаная агульным сходам настаўнікаў 14, 8, 23 і 24-й школ.

222. Па акрузе **№ 218** зарэгістрыраван Арон Майсеевіч **Левартоўскі-Аронскі,** 1895 г. нараджэння, беспартыйны, дырэктар тэкстыльнай фабрыкі № 20, вылучаны калектывам тэкстыльнага камбіната № 5.

223. Па акрузе **№ 220** зарэгістрыраван Гіпаліт Дзеанісавіч **Паеўскі,** 1913 г. нараджэння, беспартыйны, брыгадзір кандзіцерска-макароннага камбіната, вылучаны калектывам гэтага-ж камбіната.

224. Па акрузе **№ 221** зарэгістрыраван Мечыслаў Адамавіч **Козак,** 1909 г. нараджэння, беспартыйны, сталяр меблевай фабрыкі, вылучаны рабочымі, служачымі меблевай фабрыкі горпромкамбіната.

225. Па акрузе **№ 223** зарэгістрыравана Софія Іосіфаўна **Цымбрынкевіч,** 1915 г. нараджэння, беспартыйная, настаўніца 24-й школы, вылучаная агульным сходам настаўнікаў 14, 8, 23 і 24-й школ.

226. Па акрузе **№ 224** зарэгістрыраван Ісак Файвелевіч **Фукс,** 1899 г. нараджэння, беспартыйны, наборшчык друкарні, «Беластокдрук», вылучаны агульным сходам рабочых і служачых друкарні і канвертна-пераплётнай фабрыкі.

227. Па акрузе **№ 225** зарэгістрыраван Еўстафій Несцеравіч **Стаднік,** 1908 г. нараджэння, беспартыйны, саставіцель паяздоў ст. Беласток-Фабрычны, вылучаны агульным сходам рабочых, служачых і інтэлігенцыі станцыі Беласток-Фабрычны.

228. Па акрузе **№ 229** зарэгістрыравана Меланія Іосіфаўна **Малая,** 1912 г. нараджэння, беспартыйная, загадчык вучэбнай часткі 4-й школы, вылучаная агульным сходам членаў саюза пачатковых і сярэдніх школ №№ 18, 12, 4, 21 і 9.

229. Па акрузе **№ 230** зарэгістрыраван Станіслаў Міхайлавіч **Доліда,** 1914 г. нараджэння, беспартыйны, фармаўшчык-ліцейшчык чыгуналіцейнага завода, вылучаны калектывам гэтага-ж завода.

230. Па акрузе **№ 231** зарэгістрыраван Міхаіл Георгіевіч **Хацкелевіч,** 1896 г. нараджэння, ваенна-служачы, член ВКП(б), вылучаны калектывам тэкстыльнага камбіната № 2.

231. Па акрузе **№ 232** зарэгістрыраван Пётр Іванавіч **Адамскі,** 1911 г. нараджэння, беспартыйны, брыгадзір-мадэльшчык чыгуналіцейнага завода, вылучаны калектывам гэтага-ж завода.

232. Па акрузе **№ 143** зарэгістрыраван Сцяпан Іосіфавіч **Байшчак,** 1899 г. нараджэння, беспартыйны, намеснік дырэктара і загадчык вытворчасці ізразцовага завода № 15, вылучаны калектывам ізразцова-плітачнага завода № 15.

233. Па акрузе **№ 193** зарэгістрыраван Іван Пракоф'евіч **Конюх,** 1900 г. нараджэння, беспартыйны, слесар паравознага дэпо, вылучаны агульным сходам рабочых, служачых і інтэлігенцыі паравознага дэпо.

234. Па акрузе **№ 168** зарэгістрыраван Владзімір Міхайлавіч **Швараў,** 1905 г. нараджэння, член ВКП(б), начальнік гарадскога аддзела НКУС, вылучаны калектывам тэкстыльнага камбіната № 2.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Чыгуначнай выбарчай акругі № 7, горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Аляксандра Пятровіча МІСЮРОВА!

★ ★ ★

Аляксандр Пятровіч Місюроў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Жыццё Аляксандра Пятровіча да 14 год працякала ў бядняцкай сялянскай сям'і, сярод рабочых-шахцёраў Пабедзінскага рудніка, Падмаскоўнага каменавугольнага басейна. Працоўную сваю дзейнасць ён пачаў у Маскве чорнарабочым у друкарні газеты «Русское слово». Але працаваць тут доўга не прышлося. На грубыя адносіны да яго майстра ён адказаў прама і рэзка, не баючыся вынікаў. За гэта Аляксандра прагналі з работы.

У 1916 годзе ён разам з бацькам едзе працаваць на будаўніцтва Мурманскай чыгункі. Сурова іх сустрэла Кандалакша: цяжкая работа і не менш цяжкія бытавыя ўмовы. Хвароба бацькі прымусіла звярнуцца зноў у сваю вёску.

У канцы 1917 года Аляксандр едзе ў Маскву і паступае вучнем-слесарам у дэпо Маскоўска-Казанскай чыгункі. У 1919 годзе памірае бацька. Аляксандр—старэйшы ў сям'і. На яго кладзецца адказнасць за забеспячэнне сям'і. Ён вяртаецца ў сваю вёску і да 1922 года працуе паблізу сваёй сям'і — сакратаром Палянскага валаснога выканаўчага камітэта. У 1920 годзе ўступае ў члены Расійскага комуністычнага саюза моладзі, стварае ў Палянску комсамольскую арганізацыю. На рабоце ў Палянскім валасным выканкоме Аляксандр праяўляе энергічную дзейнасць, напорыстасць. У 1919 годзе яго камандыруюць упаўнаважаным па з'яццю хлебных лішкаў у заможных сялян Валадарскага раёна, цяперашняй Разанскай вобласці. У гэты час белыя банды генерала Мамантава знаходзіліся ў 8 кіламетрах ад вёскі, у якой праводзіў работу Аляксандр. Кулацкія элементы пагражаюць яму расправай. Аляксандр арганізоўвае беднату і, апіраючыся на яе, выконвае ўрадавае заданне, адгружае хлеб для пролетарскіх цэнтраў.

Белагвардзейцы пагражаюць Туле—аружэйнай майстэрні совецкай Расіі. Комсамольцы, члены профсаюза, рабочыя Пабедзінскіх руднікоў і прадпрыемстваў Тулы пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі са зброяй у руках сталі на абарону подступаў да Тулы. Аляксандр, як і тысячы рабочых, ночы праводзіць у акопах з вінтоўкай, а ўдзень працуе на рудніку, каб забяспечыць Тулу і іншыя прамысловыя гарады цэнтра



Расіі палівам. Мужна перамагаючы цяжкасці, узброеныя рабочыя сумесна з гераічнай Чырвонай Арміяй адстаялі подступы да Тулы, апракінулі і рассеялі белыя банды Мамантава, умацавалі совецкую ўладу.

На першы план высоўваецца задача гаспадарчага будаўніцтва. Аляксандр Пятровіч працуе на Пабедзінскіх рудніках шахцёрам. Разанскі губком комсамола высоўвае яго сакратаром Пабедзінскага райкома комуністычнага саюза моладзі. Энергія моладзі накіроўваецца на ўдарнае выкананне гаспадарчых планаў. Тут, на Пабедзінскім рудніку, у 1923 годзе Аляксандр уступае ў комуністычную партыю (большэвікоў).

Вясной 1924 года — прызыў на сапраўдную ваенную службу. Аляксандр Пятровіч уходзіць у рады Чырвонай Арміі. Служыць у часцях пагранічных войск. Узорна, па-большэвіцку ён выконвае воінскі абавязак. Вылучаецца сваімі незвычайнымі арганізатарскімі здольнасцямі. Пачынаючы ад чырвонаармейца і да намесніка начальніка пагранічных войск Народнага Камісарыята ўнутраных спраў Беларускай акругі — такі шлях байца - шахцёра ў радах Чырвонай Арміі.

Бязмежная адданасць соцыялістычнай радзіме, мужнае і ўзорнае выкананне заданняў совецкага ўрада—вось якасці, выхаваныя ў ім большэвіцкай партыяй і Чырвонай Арміяй. У 1938 годзе Аляксандр Пятровіч за ўзорнае выкананне спецыяльных урадавых заданняў узнагароджан ордэнам баявога Чырвонага Сцяга, а ў 1940 годзе — ордэнам Чырвонай Звязды.

У верасні 1939 года ён з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі пераходзіць совецка-польскую граніцу, удзельнічае ў гістарычным вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі, працуе членам Часовага ўпраўлення гор. Навагрудка, а пасля — начальнікам абласнога ўпраўлення НКУС па Баранавіцкай вобласці. Працоўныя Нігневіцкай выбарчай акругі, Баранавіцкай вобласці, добра ведаюць Аляксандра Пятровіча па яго рабоце і аднадушна выбіраюць яго сваім дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР. Цяпер Аляксандр Пятровіч працуе начальнікам абласнога ўпраўлення НКУС па Беластоцкай вобласці.

Аляксандр Пятровіч Місюроў нарадзіўся ў 1902 годзе, у вёсцы Мякшэва, Міласлаўскага раёна, Разанскай вобласці, у сям'і селяніна-бедняка, па нацыянальнасці—рускі.

Як адданага, мужнага сына совецкага народа, стойкага большэвіка, калектыў работнікаў Упраўлення Беластоцкай чыгункі і калектыў работнікаў 24-й тэкстыльнай фабрыкі вылучылі яго кандыдатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных па 7-й выбарчай акрузе г. Беластока.

Аляксандр Пятровіч Місюроў — дастойны кандыдат сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Г. Кузняцоў.

Выбаршчыкі Пікуцкай выбарчай акругі № 28, Бранскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Франца Владзіслававіча КЕЦА!

★ ★ ★

Франц Владзіслававіч Кец

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Франц Владзіслававіч па спецыяльнасці педагог, выдатна ведае школу, грунтоўна валодае педагагічным працэсам. 13 год таму назад ён быў радавым настаўнікам.

Нарадзіўся Франц у 1908 годзе ў горадзе Магілеве, у сям'і рабочага-паляка. 9 чалавек было ў сям'і і адзін толькі кармілец, так што было не соладка. Маленькі Франц зімой вучыўся, а летам пасвіў кароў. Не гледзячы на цяжкасці, Франц скончыў сямігодку і ў 1925 годзе паступае ў Мінскі польскі педагагічны тэхнікум. У 1926 годзе студэнт Франц Кец паступае ў ленінскі комсамол, ён вучыцца выдатна і праводзіць вялікую палітычна-грамадскую работу сярод студэнтаў: дапамагае адстаючым у вучобе, арганізоўвае культработу ў тэхнікуме. Будучы на IV курсе, ён працуе ўжо настаўнікам у 6-й польскай школе горада Мінска. У 1929 годзе, пасля паспяховага сканчэння вучобы, ён накіроўваецца ў Полацк загадчыкам вучэбнай часткі 5-й польскай школы. Потым ён працуе ў Лепельскім раёне дырэктарам рэспубліканскай школы калгаснай моладзі. Пасля рэарганізацыі гэтай школы едзе ў горад Бабруйск загадчыкам навучальнай часткі дзіцячай калоніі. Тав. Кеца шчыра палюбілі дзеці, для якіх совецкая ўлада стала роднай мацер'ю. Многа талентаў было сярод дзяцей і толькі пад жыватворнымі праменнямі соцыялізма гэтыя таленты раслі і расцвіталі. Многа ўрачоў, настаўнікаў, аграномаў і мастакоў вырасла з былых беспрытульных. Часта з імі сустракаецца Франц Владзіслававіч.

Больш 6 год тав. Кец працаваў педагогам у Віцебску, быў дырэктарам 21-й сярэдняй школы. Школа была ў ліку перадавых у горадзе як па навучальнай, так і па выхаваўчай рабоце. Быў няштатным прапагандыстам Віцебскага гаркома комсамола, яго асабліва ведалі рабочыя льнопрадзільна-ткацкай фабрыкі імені Кагановіча. Тут ён арганізоўвае вячэрнюю школу дарослых, арганізоўвае прапагандысцка-лектарскую работу. Не гледзячы на сваю нагружанасць, тав. Кец знаходзіць час для ўдасканалення сваіх ведаў, завочна вучыцца ў інстытуце, многа чытае твораў класікаў марксізма-ленінізма.

З 1939 года ён кандыдат партыі, а з 1940 года—член ВКП(б). У канцы студзеня ЦК КП(б)Б накіроўвае



комуніста-педагога тав. Кеца ў заходнія вобласці Беларусі, загадчыкам Аўгустоўскага раённага аддзела народнай асветы. Амаль год працаваў Франц Владзіслававіч у Аўгустове. Многа зроблена ў галіне школьнага будаўніцтва, школы рэарганізаваны па совецкі лад. Асабіста тав. Кец дапамог наладзіць метадычную работу ў школах, дапамог наладзіць працэс навучання і комуністычнага выхавання дзетвары, арганізаваў спаборніцтва. Франц Владзіслававіч на польскай мове зрабіў многа дакладаў для настаўнікаў на розныя тэмы. Ён перадаваў свой шматгадовы вопыт настаўніцкай работы, вопыт перадавых настаўнікаў Совецкага Саюза.

Створаны выдатны настаўніцкі актыў стаў моцнай апорай у рабоце райАНА. Многія настаўнікі вылучаны на кіруючую работу. Настаўнік Яворскі, выдатны метадыст, вылучан нядаўна дырэктарам сярэдняй школы. Яго вылучылі кандыдатам у дэпутаты сельсовета і Аўгустоўскага райсовета. Былы загадчык сельскай пачатковай школы Спавацкі працуе інспектарам-метадыстам райАНА. Настаўніца сельскай пачатковай школы Дабравольская—кандыдат у дэпутаты райсовета.

Франц Владзіслававіч таксама вылучан кандыдатам у дэпутаты Аўгустоўскага раённага Совета. У раёне няма такой вёскі, дзе-б яго не ведалі.

Нарком асветы БССР адзначыў паспяховую работу Франца Владзіслававіча ў галіне народнай асветы. 25 лістапада ён вылучан на кіруючую работу ў вобласці—загадчыкам Беластоцкага абласнога аддзела народнай асветы. Многа зроблена за год совецкай улады ў галіне народнай асветы. Лічбы і факты яскрава гавораць аб гэтым. Каля 65 мільёнаў рублёў асігнавала за год совецкая дзяржава на народную асвету ў вобласці. 1.100 настаўнікаў, якіх былыя польскія правіцелі выкінулі за борт школы, атрымалі работу ў совецкіх школах.

Школы карэнным чынам рэарганізаваны на аснове комуністычных прынцыпаў выхавання і совецкай педагогікі. Адкрыты беларускія і рускія школы, якія раней пры польскіх панах былі забаронены. На тэрыторыі былога Беластоцкага ваяводства працавала 3.162 настаўнікі. За першы год існавання совецкай улады на тэрыторыі Беластоцкай вобласці, значна меншай за былое ваяводства, лік настаўнікаў складае 4.592, а зараз налічваецца 5.960 чалавек. Не гледзячы на гэты калясальны рост, настаўнікаў усё-ж нехапае. Многа зроблена, яшчэ больш прадстаіць зрабіць. Пытанні ўсеагульнага навучання і ліквідацыі непісьменнасці — галоўныя задачы цяпер. Комуніст Франц Владзіслававіч Кец аддае сабе поўную справаздачу ў гэтай важнейшай і адказнейшай дзяржаўнай рабоце.

Працоўныя Бранскага раёна, якія вылучылі яго кандыдатуру ў дэпутаты абласнога Совета, аказалі яму высокае давер'е. Гэта яго абавязвае, не пакладаючы рук працаваць у галіне народнай асветы.

Г. Голянд.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ ГАРАДСКОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Максім Танк (Еўгеній Іванавіч Скурко)

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Ішлі эшалоны за эшалонамі. Бежанцы, закінутыя першай сусветнай імперыялістычнай вайной далёка ўглыб Расіі, вярталіся назад у родную старонку, хто з думкай аб пакінутых па той бок мяжы сваяках, хто аб кавалку зямлі. А малы 10-гадовы Жэнька Скурко аб адным толькі думаў: як перавезці на той бок мяжы страшэнную «кантрабанду»— сшытак перапісаных вершаў Пушкіна, Лермантава і іншых любімых паэтаў. З таго часу гэты сшытак стаў у новых, непрывычных абставінах польска-памешчыцкага прыгнёту ўспамінам аб краі Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Гэты сшытак і падказаў паэтычнай патуры хлопца паспрабаваць загаварыць уласным голасам. І загаварыў ён словамі, у якіх адразу пачуўся спеў будучага паэта.


16-гадовы вучань Радашковіцкай беларускай гімназіі, Максім Танк першаму свайму вершу адразу дае пуцёўку ў народ. Няма ў гэтым вершы нічога з «нашаніўскага» рэзанерства і бядавання (так характэрных для многіх маладых паэтаў Заходняй Беларусі таго часу). Гэты верш бадзёры, баявы:

«Гэй, вольныя песні,
Ідзіце туды,
Дзе звіняць яшчэ путы,
Дзе люд мой бяздольны
Кайданамі скуты,
Дзе гора смяецца,
Дзе песні пакуты,
Дзе звоніць катоўская сталь...»

16-гадовы юнак уступае ў рады падпольнага комсамола. Калі з Вільні пачуўся заклік да радашковіцкіх гімназістаў—«Таварышы, па дапамогу» — комсамолец Еўгеній Скурко ходзіць ад вучня да вучня, агітуе: «Здраднікі вызваленчай справы беларускага народа — Астроўскі, Луцкевіч і іх хэўра прадалі віленскую беларускую гімназію ворагу — польскаму акупанту. Атрымалі яны за гэта абяцанне дзяржаўныя правы для гімназіі. Паліцэйскія карэты ўсюды забіраюць лепшых вучняў— сыноў народа ў дэфензіву, адтуль на Лукішкі. Нават малышоў-першакласнікаў не пашкадавалі. Гэтых «бунтаўшчыкоў» высылаюць у вёску пад «апеку» мясцовай паліцыі. Выступім, браты, на дапамогу сваім віленскім таварышам».

Пачалася забастоўка вучняў. Еўгеній Скурко з воўчым білетам праганяецца з школы, каб хутка знайсці прытулак у мурах лукішскага астрога. Выпушчаны адтуль, тав. Скурко-Танк уходзіць у глыбокае падполле. ЦК комсамола давярае яму вельмі адказную работу: аднавіць знішчаную правакатарам Кантаровічам комсамольскую арганізацыю Навагрудчыны. Падпольшчык-паэт ходзіць па вёсках Карэліцкага, Нічневіцкага, Шчорсаўскага раёнаў, арганізуе сялянскую моладзь да барацьбы, чытае ім свае вершы, распаўсюджвае рэволюцыйную газету «Праом».

Зноў турма. У адзіночнай камеры на Лукішках Еўгеній Скурко арга-



нізуе літаратурны журнал палітзняволеных «Краты», на маленькіх старонках якога вырастае поўнакроўны паэт Максім Танк, «друкуюць» пасля свае вершы паэт-змагар Філіп Пестрак, малады пясняр Валенцій Таўлай і многія іншыя пісьменнікі.

Па дарозе з турмы Максім Танк сустрэўся з родным «беларускім морам»—Нараччу, хвалі якога асабліва бурлілі. Гэта паўсталі нарачанскія рыбакі супроць панскіх спроб адабраць у іх карміліцу-возера. З усім уласцівым Танку парывам ён кідаецца ў барацьбу. Праз яго рукі праходзіць уся нелегальная рэволюцыйная літаратура для Мядзяўскага і Крывіцкага раёнаў. Цэнтральны камітэт комсамола кліча Максіма Танка ў Вільню, дзе ў той час выходзіць рэволюцыйная газета «Наша воля». Вакол гэтай газеты трэба згуртаваць усе творчыя сілы беларускіх мас. У Вільні заварушыліся беларуска-хрысціянскія здраднікі з-пад сутаны ксяндза Станкевіча, якія змапалізавалі літаратурныя выданні. Трэба было вырваць іх. У Вільні пачаўся рэволюцыйны студэнцкі рух, асабліва сярод польскай моладзі, сярод іх было некалькі таленавітых пісьменнікаў. Максім Танк становіцца «палпрэдам» комуністычнага руху на літаратурным фронце. Талент яго расцвіў. Выходзіць яго першы зборнік «На этапах», які адразу канфіскуецца, а ў якасці «ганарару» Максім Танк атрымлівае 8 месяцаў турмы.

Вораг спрабуе аблытаць паэта-барацьбіта сецямі сваіх прыслужнікаў. Яму пагражаюць: «Калі не будзеш служыць нам — прыкончым». Не спалохаўся паэт. Вораг прабуе заманіць Танка салодкімі абяцанкамі—«паездкай па Еўропе» — але і гэта вудачка нічога не злавіла. Танк становіцца ўсё больш папулярным, асабліва сваімі вершамі «Вянок», «Спатканне», якія ведаюць і польскія і яўрэйскія працоўныя. Нават афіцыяльная польская літаратура не можа больш замоўчваць факт, што з глыбіні таго народа, якому ўрад адмовіў права існавання, вышаў паэт вялікага мастацкага палёту. Сам пан спец ад літаратуры Гетэль стараецца выклікаць усмешку на сваім твары, скрыўленым ад нянавісці да беларусаў. Ігра, разлічаная на «асваенне» Максіма Танка, аказалася дарэмнай. Кожная яго новая кніга — гэта моцны ўдар у гмах «турмы народаў» — пасляверсальскай Польшчы. Кожны новы верш Танка паглыбляе ў сэрцах народных мас імкненне да вызвалення з-пад прыгнёту польскіх паноў, да злучэння са сваімі братамі з Усходу.

Усходніх братоў, прышоўшых у верасні 1939 года, каб з'яднаць беларускі народ, Максім Танк сустрэў на баявым пасту, сярод сялянскіх мас краіны. Ён кінуўся ў працу па арганізацыі органаў совецкай улады. Ён зноў у Вільні, дзе аснуўваецца большэвіцкая газета «Віленская праўда», згуртоўвае пісьменнікаў, адданых справе вызваленага народа і краіне. У працэсе гэтай працы нараджаюцца новыя, поўныя радасці вершы вызваленага паэта Максіма Танка. Гучаць яны яшчэ з большай сілай, адгукаюцца яны на ўсё тое, што вызваленчы верасень уносіў у жыццё народа, будзяць шырокія масы да творчай, адданай працы, да хутчэйшага падняцця культурна-гаспадарчага ўзроўню нашых абласцей.

Максіма Танка — вернага сына народа, таленавітага паэта нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны — беластоцкія совецкія пісьменнікі аднагалосна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Г. Смоляр.

Сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў

Днямі адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты Гродненскага гарадскога Совета Ольгі Ігнацьеўны Карпенюк з сваімі выбаршчыкамі 174 выбарчай акругі. З прамовай выступіў даверааны тав. Філіповіч.

— Нашага кандыдата ў гарадскі Совет дэпутатаў працоўных тав. Карпенюк Ольгу Ігнацьеўну я ведаю даўно. З 1933 года я працую з ёю ў адным цэху на фанерным заводзе. Яшчэ пры ўладзе фабрыкантаў, заводчыкаў тав. Карпенюк, не шкадуючы сваіх сіл, не баючыся катаванняў і здзекаў, змагалася і адстойвала інтарэсы рабочага класа.

У 1935 годзе на заводзе ўспыхнула забастоўка. Повадам да яе паслужыла няўплата заработнай платы рабочым за 7 тыдняў, у той час, як належала выплачваць кожны тыдзень. Хутка быў выбран забастовачны камітэт, у састаў якога ўвайшла і тав. Карпенюк.

Рабочыя не выходзілі на работу і не дапускалі штрэйкбрэхераў. 7 дзён працягвалася забастоўка. Тав. Карпенюк, як член забастовачнага камітэта, прыклала многа сіл, каб здабыць сродкі для падтрымання бастуючых рабочых. Забастоўка закончылася перамогай рабочых. Гаспадар пад націскам рэволюцыйна настроеных рабочых задаволіў патрабаванні калектыва.

У 1936 годзе ў адказ на звальненне рабочых на заводзе ўспыхнула другая буйная забастоўка. На гэты раз рабочыя дзень і ноч знаходзіліся на заводзе да таго часу, пакуль іх патрабаванні не былі задаволены. Актыўны ўдзел у гэтай забастоўцы прымала тав. Карпенюк. Яе зноў выбіраюць членам забастовачнага камітэта. Не гледзячы ні на якія пагрозы магістрата і паліцыі, яна не падпісала непрыемлемыя для рабочых умовы. Праз два дні, калі прыступілі да работы, арганізатары забастоўкі, у тым ліку і тав. Карпенюк, былі звольнены з завода.

Тры годы, аж да ўстанаўлення Совецкай улады, тав. Карпенюк не магла знайсці сабе работы, бо яе нідзе не прымалі, як палітычна «ненадзейную». Толькі з прыходам Чырвонай Арміі яна зноў звярнулася на свой завод. Зноў працуе ў абрэзачным цэху і тут паказвае прыклады стаханаўскай работы. Тав. Карпенюк увесь час з чэсцю апраўдвае наша давер'е. У мінулым годзе яна была паслана дэлегатам у Народнае Сабранне. Тав. Карпенюк таксама ўдзельнічала ў рабоце гістарычнай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, якая вырашала пытанне далучэння Заходняй Беларусі да БССР.

У хуткім часе, як лепшую работніцу-стаханаўку, яе выбралі старшынёй заўкома. На гэтай пасадзе тав. Карпенюк апраўдвае сябе. Яна зарэкамендавала сябе, як добры працаўнік і чулы таварыш. Часта да яе звяртаюцца рабочыя за дапамогай, парадай. І кожнаму з іх яна імкнецца дапамагчы, даць талковы адказ.

★ ★ ★

У 50-й выбарчай акрузе па выбарах у раённы Совет адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты Валкавыскага райсовета з выбаршчыкамі. На сустрэчы прысутнічала каля 200 чалавек.

Пасля кароткага даклада аб прадстаячых выбарах і задачах выбаршчыкаў выступіў цёпла сустрэнуты прысутнымі кандыдат у дэпутаты раённага Совета сакратар Валкавыскага райкома партыі Васілій Ефімавіч Тузаў.

— Выбаршчыкі 50-й акругі, — гаворыць тав. Тузаў, — аказалі мне вялікую чэсць і давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты райсовета. На працягу свайго свядомага жыцця я стараўся чэсна служыць інтарэсам працоўнага народа. Як член большэвіцкай партыі, знаходзячыся на кіруючай совецкай і партыйнай рабоце, я добрасумленна выконваў даручаную справу. У далейшым, будучы выбраннікам народа, пастараюся ўсю сваю дзейнасць накіраваць на рост магутнасці краіны соцыялізма. Ад усяго сэрца дзякую за аказанае высокае давер'е і запэўніваю сваіх выбаршчыкаў, што буду старацца быць дэпутатам ленінска-сталінскага тыпу.

Выступаючыя тт. Агульнік, Влодцкі, Малашчэнка заклікалі выбаршчыкаў у дзень выбараў галасаваць за кандыдатуру тав. Тузава.

★ ★ ★

У гарадскім тэатры Гродна адбылася сустрэча выбаршчыкаў 12-й выбарчай акругі па выбарах у абласны Совет з сваім кандыдатам Сяргеем Іванавічам Мальцавым. На сустрэчы прысутнічала больш 700 чалавек. Тав. Мальцаў зрабіў даклад аб дасягненнях працоўных заходніх абласцей. Вялікую ўвагу тав. Мальцаў удзяліў падрыхтоўцы да надыходзячых выбараў. Пасля даклада ўзяў слова рабочы веласіпеднага завода тав. Савоська.

— Наш кандыдат тав. Мальцаў,—гаворыць ён,—змагаўся на франтах грамадзянскай вайны супроць ворагаў. На ўсіх участках, куды яго пасылала партыя, ён паказаў сябе як стойкі большэвік, адданы партыі Леніна—Сталіна. За такога чалавека мы ўсе як адзін аддадзім свае галасы.

Выступілі таксама хатняя гаспадыня тав. Барысава, работніца кафейнай фабрыкі тав. Кан. Яны заявілі, што выбаршчыкі 12-й акругі гатовы аднадушна аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

РОСТ ГРОДНЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

За 10 месяцаў гэтага года гродненская партыйная арганізацыя прыняла ў свае рады 47 таварышоў. Усе прынятыя з'яўляюцца перадавымі людзьмі горада, якія на практычнай рабоце даказалі адданасць большэвіцкай партыі.

Пярвічная партыйная арганізацыя горсовета ў кандыдаты партыі прыняла лепшую актывістку тав. Шпільман. У перыяд кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР тав. Шпільман працавала старшынёй участковай выбарчай камісіі. Зараз тав. Шпільман таксама актыўна ўдзельнічае ў рабоце па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы.

Сярод рабочых дэпо вялікім аўтарытэтам карыстаецца машыніст тав. Рыбакоў. Працуючы на паравозе, ён паказвае ўзоры высокай прадукцыйнасці працы. Нядаўна тав. Рыбакоў вылучан на пасаду інструктара паравознай службы. З гэтай работай ён паспяхова спраўляецца, актыўна ўдзельнічае ў партыйным жыцці. Партарганізацыя дэпо аднадушна прыняла яго ў члены партыі.

Прынятыя ў члены і кандыдаты партыі многа працуюць над павышэннем сваіх тэарэтычных ведаў. Кандыдат партыі тав. Бандарэнка сістэматычна павышае свой ідэйна-палітычны ўзровень. Зараз ён заканчвае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

У партыю прынята работніца гораддзела НКУС тав. Шацілава. Да прыезду ў Гродна яна 8 год працавала на фабрыцы, дзе з'яўлялася лепшай стаханаўкай. Цяпер тав. Шацілава вядзе вялікую работу сярод жанчын, вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

Партыйныя арганізацыі горада за апошні час значна палепшылі работу з кандыдатамі партыі. Сакратар пярвічнай партарганізацыі пры ўпраўленні мясцовай проціпаветранай абароны тав. Антропаў паўсядзённа гутарыць з маладымі комуністамі і дапамагае ім у рабоце. Нядаўна прыняты ў кандыдаты партыі тав. Вярцелецкі добра асвоіў свой участак работы, а ў праведзеных вучэннях ён заняў першае месца.

Гарком партыі правёў рад мерапрыемстваў па паляпшэнню работы з кандыдатамі партыі. Адбыўся агульнагарадскі сход кандыдатаў партыі, дзе прачытан даклад аб статуце ВКП(б). На гэтым сходзе прысутнічалі ўсе кандыдаты партыі. Ва ўсіх пярвічных арганізацыях праведзены нарады з кандыдатамі ВКП(б).

Трэба адзначыць, што ў рабоце гарадской арганізацыі па прыёму ў партыю і ў рабоце з кандыдатамі ёсць нямала недахопаў. Некаторыя пярвічныя арганізацыі яшчэ дрэнна выконваюць пастанову ЦК ВКП(б) аб ліквідацыі недахопаў у мясцовых партарганізацыях у справе прыёму новых членаў ВКП(б). Так, партарганізацыя дэпо яшчэ не ліквідавала асуджаную партыяй упрашчэнчаскую практыку павярхоўнага разбору заяў аб прыёме ў партыю без папярэдняга вывучэння прымаемых і ўсебаковага абмеркавання прымаемага на партсходах. Нядаўна ў кандыдаты партыі прынят інжынер А., які працуе ў дэпо толькі 2 месяцы.

Праведзеная нядаўна гаркомам партыі праверка работы з кандыдатамі паказала, што асобныя кіраўнікі партарганізацый пасля прыёму не праяўляюць неабходных клопатаў аб комуністычным выхаванні і не ўцягваюць маладых комуністаў у актыўнае партыйнае жыццё.

У партыйнай арганізацыі вагоннага ўчастка ёсць два кандыдаты партыі з пратэрмінаваным стажам. Тав. Абрамоўскі з'яўляецца кандыдатам партыі з 1932 года. Сакратар-жа гэтай партарганізацыі тав. Ушанёў ні разу не гутарыў з кандыдатамі партыі, не цікавіўся іх работай.

Гарадскі камітэт партыі прымае рад мер да таго, каб наладзіць і палепшыць работу з кандыдатамі. На бюро гаркома рэгулярна заслухоўваюцца справаздачы партарганізацый аб іх рабоце з кандыдатамі і аб ходзе прыёму новых комуністаў.

М. САХРАЙ,
загадчык оргінструктарскага аддзела Гродненскага гаркома КП(б)Б.

На канферэнцыі армейскіх большэвікоў

У зале гарнізоннага парткабінета адбылася канферэнцыя большэвікоў Н-скага злучэння, дзе камандзірам тав. Прохараў.

Дэлегаты ўважліва праслухалі змястоўны даклад тав. Жукава, у якім перш за ўсё было адзначана, што партарганізацыя прышла да сваёй канферэнцыі цесна згуртаванай вакол Цэнтральнага Камітэта партыі і вялікага Сталіна, што партарганізацыя готова да выканання любога задання партыі і ўрада.

У жыцці часцей і падраздзяленняў комуністы і комсамольцы займаюць вядучае месца. Партыйныя арганізацыі, выконваючы ўказанні народнага камісара абароны і галоўнага ўпраўлення палітпрапаганды, перанеслі цэнтр сваёй работы ў дробныя падраздзяленні, туды, дзе рашаецца поспех баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Агітацыя і прапаганда пачалі праводзіцца больш канкрэтна і мэтанакіравана. Прыкладам гэтага могуць служыць сакратары партбюро тт. Галецкі і Гінзбург, якія змаглі правільна накіраваць свае партарганізацыі на вырашэнне стаячых перад імі задач. Яны самі праводзяць вялікую работу і патрабуюць ад сваіх комуністаў быць у авангардзе вучобы. Падраздзяленне камандзіра-комуніста тав. Сыскова заняла першае месца ў злучэнні па баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

Гаворачы аб пільнасці, тав. Жукаў паведамляе, што чырвонаармейцамі падраздзяленняў затрымана больш 150 нарушальнікаў дзяржаўнай граніцы.

Рэзка палепшылася кіраўніцтва партыйных арганізацый комсамолам. Ёсць арганізацыі, дзе да 70 процантаў комсамольцаў з'яўляюцца выдатнікамі вучобы.

Канферэнцыя таксама заслухала даклад аб рабоце партыйнай камісіі. Дакладчык тав. Данілаў прывёў лічбы росту партарганізацыі, даложыў аб тым, як камісія змагалася за чыстату партыйных радоў.

Спрэчкі па дакладах насілі выключна актыўны характар. Больш палавіны дэлегатаў выступілі ў спрэчках. Іх выступленні былі прасякнуты большэвіцкай самакрытыкай і крытыкай асобных недахопаў.

Выбраннем новага саставу партыйнай камісіі і дэлегатаў на акруговую партканферэнцыю закончыла сваю работу партканферэнцыя.

П. Іванэў.



На здымку: Выбаршчыкі 6-га выбарчага ўчастка (вуліца імені Чкалава) горада Беластока ў памяшканні ўчастка чытаюць газеты і літаратуру аб выбарах.

Фота А. Сапіра.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ

Голас маладых выбаршчыкаў

Днямі ў беластоцкім Доме Чырвонай Арміі адбыўся агульнагарадскі сход маладых выбаршчыкаў. На сходзе маладыя рабочыя, служачыя і інтэлігенты расказалі аб тым, з якім палітычным уздымам яны—роўнапраўныя грамадзяне краіны соцыялізма—рыхтуюцца да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. З вялікім уздымам прынята пісьмо да ўсіх маладых выбаршчыкаў Беластоцкай вобласці. У сваім пісьме маладыя выбаршчыкі горада Беластока пішуць:

«15 снежня 1940 г. працоўныя нашай вобласці будуць выбіраць дэпутатаў у мясцовыя Советы. У гэты дзень вызвалены народ пойдзе да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У нядаўнім мінулым моладзь да 24 год была поўнасцю пазбаўлена выбарчых правоў. Толькі ў Беластоцкай вобласці 135 тысяч чалавек моладзі былі пазбаўлены магчымасці актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці.

Зараз больш 620 чалавек моладзі працуюць членамі акруговых камісій па выбарах у раённыя Советы, 5.285 чалавек—агітатарамі. Кандыдатамі ў дэпутаты ў абласны Совет вылучана 17 юнакоў і дзяўчат.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных суправаджаецца вялікім вытворчым уздымам. Комсамольска-маладзёжная брыгада 1-га камбіната вытворчы план за лістапад выканала на 110 процантаў. Кожны дзень растуць рады стаханаўцаў сярод моладзі. Многа маладых рабочых і калгаснікаў вылучаны на кіруючыя пасты ў прамысловасці і советкіх установах.

Мы заклікаем усіх маладых выбаршчыкаў Беластоцкай вобласці ў дзень 15 снежня арганізавана і дружна прыйсці да выбарчых урнаў і аддаць свае галасы за кандыдатаў народа. Гэтым самым мы яшчэ раз сумесна з усімі працоўнымі прадэманстрыруем сваю гарачую любоў і адданасць радзіме, партыі Леніна—Сталіна і лепшаму другу советкай моладзі таварышу Сталіну».

БУДЗЕМ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА НАШЫХ КАНДЫДАТАЎ

У Кнышынскім раёне адбыўся сход маладых выбаршчыкаў, на якім прысутнічала 100 чалавек. Сход прыняў зварот да ўсіх выбаршчыкаў Беластоцкай вобласці, у якім заклікае іх 15-га снежня аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

— Мы вельмі рады, — гаворыцца ў звароце, — што назаўсёды вызвалены ад іга капіталістаў і памешчыкаў, што народы заходніх абласцей Беларусі ўвайшлі ў адзіную сям'ю народаў СССР.

Моладзь былой панскай Польшчы не мела права выбіраць і быць выбранай. Мы рады, што ўпершыню па Сталінскай Канстытуцыі атрымалі права выбіраць лепшых людзей у органы сваёй улады.

У дзень выбараў мы ўсе як адзін прыйдзем да выбарчых урнаў і аддадзім свае галасы за нерушымы блок комуністаў і беспартыйных.

Грышкін,
сакратар Кнышынскага райкома ЛКСМБ.

Актыўна рыхтуюцца да выбараў

Ва ўсіх вёсках і паселішчах Макараўскага сельсовета, Крынкаўскага раёна, рэгулярна працуюць гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, якімі кіруюць настаўнікі і актывісты сельсовета. У рабоце гурткоў удзельнічаюць усе выбаршчыкі. Вялікую цікавасць выклікаюць пытанні міжнароднага становішча.

Адбываюцца сустрэчы выбаршчыкаў з сваімі кандыдатамі. Гэтыя сустрэчы ператвараюцца ў яркія дэманстрацыі советкага патрыятызма.

Глыбока вывучаюць выбаршчыкі прамову таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе Сталінскай акругі гор. Масквы. Асобныя раздзелы прамовы таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі агітатары растлумачваюць на канкрэтных прыкладах з мясцовага жыцця.

Калгаснікі з сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, дзе старшынёй з'яўляецца дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Чэкіль, прынялі рашэнне да дня выбараў поўнасцю закончыць усе сельскагаспадарчыя работы.

В. Бальзоўскі.

Дамбраўскі раён напярэдадні выбараў

Велізарнымі дасягненнямі сустракаюць працоўныя Дамбраўскага раёна дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У жыцці працоўных раёна адбыліся вялікія змяненні. Пры раздзеле памешчыцкіх зямель больш тысячы абяздоленых сем'яў атрымалі амаль 5 тысяч гектараў зямлі. Ім раздана многа коней, жывёлы і сельскагаспадарчых машын.

Перадавое сялянства раёна цвёрда становіцца на калектыўны шлях. Арганізаваныя калгасы паказваюць узоры добрай работы. Зараз калгасы падводзяць вынікі сваёй калектыўнай працы. Гэтыя вынікі ўсяляюць у іх радасць і ўпэўненасць у лепшую будучыню. У сярэднім па раёну вага аднаго працадня складае да 5 кілограмаў зярна і 14 кілограмаў бульбы. Сям'я члена арцелі імені Сталіна т. Харытона Краева атрымала на свае працадні 300 пудоў хлеба і больш тысячы пудоў бульбы. У калгасах расце грамадская гаспадарка, створаны жывёлагадоўчыя фермы.

Вялікія дасягненні мае раён у справе народнай асветы. У школах дзеці бясплатна навучаюцца на сваёй роднай мове. Зараз у раёне працуюць 50 пачатковых, 12 няпоўных сярэдніх і 1 сярэдняя школа. Аб вялікім імкненні насельніцтва да ведаў гаворыць і такі факт, што ў вячэрніх школах для дарослых займаецца амаль 2000 мужчын і жанчын. Працуюць звыш 30 хат-чытален, бібліятэк і чырвоных куткоў.

У справе аховы здароўя па раёну праароблена таксама вялікая работа. Адкрыта шырокая сетка бальніц, амбулаторый і медыцынскіх пунктаў. Пры польскіх панах на тэрыторыі раёна не было ні адной бальніцы і амбулаторыі. У радзе мястэчак медыцынскую дапамогу аказвалі прыватныя ўрачы. Сярод насельніцтва наглядалася вялікая смертнасць, сярод дзяцей яна даходзіла да 20 процантаў. З-за недаядання трывалае гняздо звіў сабе туберкулёз. Акрамя бальніц і амбулаторый адкрыты зубалячэбныя пункты, аптэка, у якіх працуе некалькі дзесяткаў спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

Вялікая работа праведзена і па разгортванню советкага гандлю.

Па дарожнаму будаўніцтву капітальна адрамантавана 40 кілометраў дарог і заканчваецца новая дарога Багны—Дамураты.

Змянілася аблічча гарадскіх паселішчаў і вёсак. У іх абсталяваны новыя будынкі, бальніцы, школы і амбулаторыі, хаты-чытальні. У раённым цэнтры пабудаван будынак райвыканкома, бальніца, пачынаецца будаўніцтва школы, часткова закончана будаўніцтва клуба, разлічанага на 500 месц.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя раёна з небывалым палітычным уздымам рыхтуюцца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У сёлах і вёсках актыўна праходзяць перадвыбарчыя сходы выбаршчыкаў, сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты.

Наступіў самы адказны этап выбарчай кампаніі. Усё шырэй разгортваецца агітацыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, заканчваецца абсталяванне выбарчых участкаў. Выбарчая кампанія наглядна дэманструе ўзрослую палітычную актыўнасць мас, згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна і советкага ўрада.

У раёне праведзена звыш 1.000 сходаў і мітынгаў выбаршчыкаў, на якіх прысутнічала больш 100 тысяч чалавек. На перадвыбарчых сходах і мітынгах працоўныя з вялікай увагай абмяркоўвалі кандыдатуры кандыдатаў у абласныя, раённыя, сельскія, пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных. Толькі лепшыя прадстаўнікі народа, да канца адданыя справе большэвіцкай партыі, удастоены вялікай чэсці. Усяго па раёну зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў 409 чалавек.

Больш тысячы агітатараў, прапагандыстаў, членаў участковых і акруговых камісій, чытчыкаў і бяседчыкаў умела нясуць словы большэвіцкай праўды ў масы выбаршчыкаў. На канкрэтных прыкладах яны расказваюць аб перамогах соцыялізма ў СССР, аб тых карэнных змяненнях, якія адбыліся ў жыцці рабочых, сялян і інтэлігенцыі пасля іх вызвалення.

У раёне добра вядомы імёны лепшых актывістаў - вылучэнцаў. Сялянка-бядначка Любоў Дземях цяпер працуе старшынёй пасялковага Совета. Былы батрак тав. Гаракоп кіруе Круглянскім сельскім советам. Адным з лепшых старшынь сельскіх советаў з'яўляецца тав. Хомік. У Сідранскім сельсовеце пад яго кіраўніцтвам створаны моцны актыў. Сакратаром Чэрвонскага сельсовета працуе маладая энергічная дзяўчына Падургель. Да прыходу Чырвонай Арміі яна была батрачкай. Добра вядома ў раёне імя ўрача грамадзянкі Рэгіны Іосіфаўны Вітукевіч. Усе гэтыя таварышы выраслі на практычнай рабоце, і зараз вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў.

Вялікі палітычны вытворчы ўздым працоўных раёна з'яўляецца залогам таго, што прадстаячыя выбары прынясуць новую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Н. Саракалетаў,
старшыня Дамбраўскага райвыканкома.

БУДУЧЫЯ СЛЕСАРЫ І ТОКАРЫ

ГРОДНА. Яшчэ ў карыдоры чуваць стук малаткоў. Гэта вучні слясарнага цэха Гродненскага рамеслёнага вучылішча замацоўваюць свае тэарэтычныя веды на практыцы. Яны ўжо азнаёміліся з інструментамі.

Сёння ў іх задача: рубка і абпілоўка пліткі пад вугольнік. Гэта — адзін з галоўных момантаў слясарнай справы. Па праграме на ўсваенне гэтага працэса адведзена 25 дзён. Над рубкай і абпілоўкай пліткі вучні працуюць толькі другі дзень, але некаторыя з іх нядрэнна спраўляюцца з сваёй задачай. Асабліва вызначаюцца вучні Грыгорый Лукашык і Владзімір Якубаў. Стойка пры рабоце ў іх правільная, напільнік роўна і плаўна ходзіць па бруску. Кронцыркуль, малаток, вугольнік,—кожная з гэтых прылад мае сваё пэўнае месца.

Кожная рэч на сваім месцы — вось адно з правілаў слясарнай справы, пры захаванні якога значна павышаецца прадукцыйнасць працы. Владзімір і Грыгорый ужо зараз прызвычаіліся да гэтага асноўнага правіла.

Бацька Грыгорыя працуе на гродненскім лесазаводзе. У свой час ён вельмі хацеў набыць спецыяльнасць, але не мог, сродкаў не было. Грыгорый да паступлення ў рамеслёнае вучылішча займаўся ў пятым класе школы № 1 імені Кірава. Ён не раз марыў мець справу з жалезам, рабіць з яго дэталі для машын.

Значныя поспехі на практыцы паказваюць вучні Дзмітрый Нерад і Владзімір Піхун. Валодзя — калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Шлях да комунізма». Да паступлення ў школу ён выпрацаваў 102 працадні. У кніжцы Дзмітрыя значыцца 150 працадзён.

У механічным цэху група вучняў—будучых токараў—уважліва сочыць за работай Анатолія Філонепка. Ён ад майстра цэха атрымаў задачу: зняць і надзець планшайбу на такарны станок. Анатолій разабраныя часткі кладзе на спецыяльную драўляную падкладку.

Анатолій—сын урача, але ён пажадаў набыць спецыяльнасць токара, бацька не стаў супярэчыць. Калі першы раз Толя прышоў на заняткі, бацька сказаў:

— Ну, сын, ідзі вучыся. У нашай краіне прафесія токара, як і ўрача, пачотная.

Будучыя токары атрымалі ўжо агульныя веды аб усіх маючыхся ў цэху станках. Вывучылі таксама і ўмеюць карыстацца штангелем, цыркулем і іншымі прыборамі. Зараз яны дэтальна вывучаюць такарны станок.

Г. Лупсякоў.

Наладзіць масавую работу

З вялікім жаданнем прызыўнікі ішлі ў чыгуначнае вучылішча. Гэта і зразумела. Наша советкая моладзь хоча вадзіць паязды, быць высокакваліфікаванымі слёсарамі, токарамі і спецыялістамі іншых прафесій.

У Беластоцкім чыгуначным вучылішчы мы арганізавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, духавы аркестр. Вучні вучылішча з вялікай ахвотай прымаюць удзел у рабоце гурткоў.

Аднак, трэба ўказаць на рад істотных недахопаў, якія маюць месца ў арганізацыі палітмасавай работы. Адным з недахопаў з'яўляецца зусім слабая пастаноўка выхавання.

Гарком комсамола да гэтага часу нічога не зрабіў па наладжванню масавай работы сярод вучняў чыгуначнага вучылішча.

П. Грышын.

Лесавывазкі не арганізаваны

ВАЛКАВЫСК. **(Ад нашага карэспандэнта).** З кожным днём у раёне ўсё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва сярод лесарубаў і возчыкаў. З Гудзевіцкага, Талькаўскага, Баблоўскага і іншых сельсоветаў штодзённа выязджаюць на лесавывазкі па 100 і больш падвод. Многія сяляне паказваюць добрыя ўзоры работы. Сяляне Біскупіцкага сельсовета Качынскі і Парэмскі на вывазцы лесу выконваюць па дзве нормы. Возчыкі Ізабелінскага сельсовета Мелешкевіч, Талей і Прохар выконваюць норму на 125—140 процантаў.

Аднак большасць падвод на лесавывазцы выкарыстоўваюцца надзвычай дрэнна. Напрыклад, 5 снежня з Талькаўскага сельсовета прыехала ў лес 107 падвод, якія за дзень вывезлі толькі 65 кубаметраў, 120 падвод з Баблоўскага сельсовета вывезлі 84 кубаметры, 108 падвод з Гудзевіцкага сельсовета—75 кубаметраў. Прычыны такой нізкай прадукцыйнасці возчыкаў тлумачацца тым, што возчыкі з далёкіх вёсак пасылаюцца на лесавывазку на адзін дзень. Так, сялянам Гудзевіцкага і іншых сельсоветаў, якім да месца работы 18—20 кілометраў, за дзень спраўляюцца толькі заехаць туды і назад, а працаваць няма калі.

Сур'ёзным недахопам у арганізацыі лесазагатовак і вывазкі з'яўляецца тое, што работнікі леспрамгаса і лесаўчасткаў лепшыя метады работы не папулярызіруюць сярод лесарубаў і возчыкаў.

План лесазагатовак па раёну выканан толькі на 21,5 проціанта, а лесавывазкі — на 29,1 проціанта. Раённыя партыйныя, советкія арганізацыі не прымаюць належных мер, каб па-большэвіцку арганізаваць лесазагатоўкі і лесавывазкі.

Д. Казлоў.

Будні асоавіяхімаўскіх арганізацый

У Скідэльскім раёне за мінулы год падрыхтавана 340 значкістаў проціпаветранай і хімічнай абароны першай ступені і 30 значкістаў ППХА другой ступені. У сельсоветах налічваецца 56 асоавіяхімаўскіх арганізацый з 1.550 членамі. Зараз у пярвічных арганізацыях працуюць 22 гурткі па падрыхтоўцы значкістаў ППХА, у якіх навучаецца 360 чалавек.

Раённы совет Асоавіяхіма ўдзяляе выключную ўвагу перабудове ваеннай падрыхтоўцы ў арганізацыях Асоавіяхіма, камплектаванню груп, каманд і атрадаў. Добра працуе арганізацыя пры Скідэльскай сярэдняй школе. Тут 195 вучняў з'яўляюцца членамі Асоавіяхіма, з якіх 80 вучняў ужо здалі нормы на атрыманне значка ППХА першай ступені.

Скідэльскія асоавіяхімаўцы ўступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва з гродненскай раённай асоавіяхімаўскай арганізацыяй. У соцыялістычным дагаворы абодва раёны ўзялі канкрэтныя абавязацельствы па паляпшэнню абароннай работы сярод працоўных.

С. Мышэлэў,
старшыня скідэльскага райсовета Асоавіяхіма.

* * *

У Кнышынскім раёне выраслі кадры актывістаў абароннай работы. У мястэчку Ясіноўка пры скурзаводзе рэгулярна праходзяць заняткі абароннага гуртка, у якім займаецца 20 чалавек. Асоавіяхімаўцы завода арганізавалі ваенную вучобу. Работай асоавіяхімаўскай арганізацыі кіруе лепшы стаханавец тав. Кулеўскі. Усяго ў раёне арганізавана 14 асоавіяхімаўскіх арганізацый, з якіх дзве створаны ў калгасах. Нядаўна ў раённым цэнтры праведзена нарада актыва асоавіяхімаўцаў, на якой выступілі ўдзельнікі баёў з белафінамі.

Г. Агадшанян,
старшыня кнышынскага райсовета Асоавіяхіма.

* * *

Цэханавецкі раённы совет Асоавіяхіма праводзіць вялікую работу сярод працоўных. У раёне з кожным днём расце лік актывістаў асоавіяхімаўцаў. Нядаўна 42 чалавека здалі нормы на значок ППХА. Акрамя таго арганізавана два ваенізіраваных паходы. Адзін з іх быў праведзен на дыстанцыю 40 кілометраў. Увесь шлях удзельнікі пераходу прайшлі ў проціvагазах.

Сярод сялян, рабочых і служачых наглядаецца вялікая цяга да ваенных ведаў. Яны актыўна наведваюць заняткі абаронных гурткоў і ўступаюць у члены Асоавіяхіма. Толькі за апошнія два месяцы ў Асоавіяхім уступіла 300 чалавек. Створана рад новых пярвічных арганізацый.

Добра працуе пярвічная асоавіяхімаўская арганізацыя ў соўгасе «Клюкава», у якой налічваецца 36 членаў. Нядаўна ў соўгасе быў арганізаван пераход у проціvагазах, у якім прынялі ўдзел усе маладыя рабочыя соўгаса. На курсах інструктараў ППХА зараз займаецца 30 чалавек.

Д. Хворост.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

СТАНОВІШЧА НА ГРЭКА-ІТАЛЬЯНСКІМ ФРОНЦЕ

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на звесткі, якія атрыманы ў аўтарытэтных лонданскіх ваенных кругах, паведамляе, што ў сувязі з моцным снегападам ваенныя аперацыі ў паўночным сектары албанскага фронта затруднены. Супраціўленне італьянцаў у раёне Паградзеца ўзмацнілася. Аднак грэкі некалькі прасунуліся паміж двума галоўнымі далінамі рэк раёна. У цэнтральнай частцы Албаніі італьянцы, як паведамляюць, пакінулі горад Клісуры. Найбольш буйнае наступленне грэкаў працягваецца ў прыўзбярэжным сектары. Звесткі, паступіўшыя ў Лондан, сведчаць аб тым, што грэкі зараз знаходзяцца ў Пікерасе (прыблізна ў 15 мілях на поўнач ад Санці-Кваранта).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў АЛБАНІІ

БЕЛГРАД, 10 снежня. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Палітыка» паведамляе з манастыра св. Наума (на возеры Охрыда): «Пасля зацішша, якое працягвалася некалькі дзён, учора на гарах паблізу Паградзеца зноў адбыўся бой. Звесткі аб яго выхадзе няма. Аднак некаторыя сцвярджаюць, што грэкам удалося нямнога прасунуцца ў напрамку да горада Эльбасан. На гары ўдалося прасунуцца ўперад, дзякуючы дзеянням левага фланга. Грэкі падышлі да ракі Шкумба ля сяла Дуніца. Ваенныя дзеянні адбываліся ў бездарожнай мясцовасці, што затрудняла забеспячэнне войск боепрыпасамі і прадуктамі. Грэчаскія часці, якія дзейнічалі на фронце каля ракі Эзровы, злучыліся з войскамі, якія дзейнічаюць у даліне ракі Дэвол.

У рэзультаце баёў на гары Камна грэкі адкрылі сабе дарогу да горада Эльбасан. Калі грэкі працягнуць свае наступленне к Эльбасану, італьянскія часці, што знаходзяцца на гары Мокра, акажуцца ў вельмі цяжкім становішчы.

ПАШКОДЖАННЕ КАНАДСКАГА ЭСМІНЦА ГЕРМАНСКАЙ ПАДВОДНАЙ ЛОДКАЙ

БЕРЛІН, 10 снежня. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, у Атлантычным акіяне адбыўся бой паміж германскай падводнай лодкай і канадскім эсмінцам «Сагеней». Германская падводная лодка ўдала тарпедыравала эсмінец, прычыніўшы яму сур'ёзныя пашкоджанні. На барту эсмінца маецца 21 забіты і 16 раненых.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ РУМЫНСКІХ УЛАД

БЕРЛІН, 10 снежня. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Трансоцеан, у Бухарэсце апублікавана ўрадавае распараджэнне, па якому пражываючыя за граніцай румыны «будуць пазбаўляцца румынскага падданства ў выпадку абвінавачвання іх у нелаяльных дзеяннях да Румыніі ці ў нанясенні ўрону рэпутацыі і інтарэсам румынскай дзяржавы».

ВАЙНА Ў АФРЫЦЫ

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра камюніке англійскага камандавання: «аперацыі ў Заходняй пустыні працягваюцца з поспехам. Згодна паступіўшых да гэтага часу звестак, колькасць захопленых італьянскіх палонных перавышае 4.000. Захоплена таксама некалькі сярэдніх танкаў».

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Згодна камюніке міністэрства авіяцыі, буйныя злучэнні англійскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў прадпрынялі 9 снежня налёт на Бардо. Гэты порт на французскім узбярэжжы Біскайскага заліва выкарыстоўваецца немцамі ў якасці базы падводных лодак. Аперацыі бамбардыроўшчыкаў працягваліся звыш двух з паловай гадзін.

Адзначана многа прамых пападанняў бомб у разнастайныя збудаванні порта. Адбыўся вялікі лік узрываў. Полымя пажараў можна было бачыць за 50 міль. Многа цяжкіх фугасных бомб упала ў непасрэднай блізасці ад германскіх падводных лодак. У раёне шлюзавых варот таксама адбылося многа ўзрываў. Паміма гэтага, англійскія самалёты бамбардыравалі размешчаны недалёка ад порта завод авіяматораў.

Англійскія самалёты сустрэлі моцнае супраціўленне з боку магутных зенітных батарэй немцаў.

У камюніке ўказваецца, што англійская авіяцыя зрабіла таксама налёт на Лорыан, дзе размешчана другая пасля Бардо германская база падводных лодак на французскім узбярэжжа Атлантычнага акіяна.

Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, у Лондане афіцыяльна паведамляюць, што англійскі крэйсер «Дзіомед» затрымаў паблізу паўднёвага ўзбярэжжа Кубы германскі грузавы параход «Ідэрвальд» танажам у 5.000 тон. Каманда германскага парахода у саставе 45 чалавек узята ў палон.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 10 снежня. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае камюніке вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, апублікаванае ўвечары 9 снежня: «Сёння баі працягваліся таксама з поспехам. Мы зноў прасунуліся ўперад».

У камюніке грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспекі гаворыцца, што на працягу 9 снежня італьянская авіяцыя не зрабіла ніякіх налётаў на грэчаскую тэрыторыю.

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што грэкі хутка прасоўваюцца ў напрамку да горада Хімара, які размешчан у 35 кіламетрах к захаду ад Аргірокастрона, на ўзбярэжжы паміж Санці-Кваранта і Балона.

Італьянскія ар'ергарды аказваюць рашучае супраціўленне грэчаскаму наступленню і прыбягаюць да тактыкі, разлічанай на тое, каб раздзяляць грэчаскія часці на дробныя атрады і такім чынам атрымаць магчымасць перайсці к паспяховаму контрнаступленню.

Ваенныя дзеянні ў Заходняй пустыні

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, учора на досвітку англійскія войскі прадпрынялі атаку на італьянскія пазіцыі на поўдзень ад Сідзі-Барані. Ім удалося захапіць італьянскі ўзброены лагер. Атака англійскай пяхоты падтрымлівацца дзеяннямі флота і авіяцыі.

Па атрыманых учора ўвечары ў Лондане звестках, англійскія аперацыі на шырокім фронце ў Заходняй пустыні праходзяць паспяхова. Англічане захапілі ўжо 1 тысячу італьянскіх палонных.

У спецыяльным камюніке міністэрства англійскіх паветраных сіл, апублікаваным 9 снежня ўвечары ў Каіры, гаворыцца: «Дзейнічаючы ў цесным супрацоўніцтве з арміяй, англійскія паветраныя сілы беспярэпынна бамбардыроўкай і кулямётным агнём нанеслі значны ўрон італьянскаму мататранспарту і воінскім часцям. Англійскія самалёты зрабілі рад паспяховых наступальных аперацый уперадзе прасоўваючыхся англійскіх войск. Збіты два непрыяцельскіх самалёты.

Бамбардыравана некалькі італьянскіх аэрадромаў. У Эль-Эдземе разбураны ангар. У ноч на 9 снежня англійская авіяцыя асабліва жорстка і працягла бамбардыравала Беніну, дзе было скінута звыш 20 тон бомб на аэрадром і іншыя аб'екты. У рэзультаце бамбардыроўкі ўзніклі пажары. Увесь аэрадром быў ахоплен полымем. Англійская авіяцыя падвергла таксама бамбардыроўцы Сідзі-Барані, Солум і Бардзію».

ЛОНДАН, 10 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што, па атрыманых у Лондане звестках, наступленне англійскіх войск на Егіпецка-Лівійскім фронце накіравана супроць італьянскага правага фланга і што па свайму характару прадстаўляе сабой раптоўны ўдар з вадочнай мэтай—адкінуць італьянскія сілы назад да мора, дзе дзеянні англійскага ваенна-марскога флота зробяць іх становішча цяжкім.

Унутранае становішча Японіі

ТОКІО, 10 снежня. (ТАСС). Газета «Міяко» піша, што Каноэ прыкладае ўсе намаганні к таму, каб перамагчы цяперашнія сур'ёзныя цяжкасці. Ён рашыў, па словах газеты, у корані спыніць палітычныя інтрыгі і групавыя чуткі, накіраваныя супроць урада. Каноэ зробіць змяненні ў асабістым складзе сакратарыята «Асацыяцыі дапамогі трону». Складаная ўнутрыпалітычная абстаноўка прывяла да неабходнасці ўключыць Хіранума ў састаў кабінета ў якасці міністра без партфеля. Мяркуюць, што ў рэзультаце стварэння блока Каноэ-Хіранума будуць праведзены значныя змяненні ва ўнутранай палітыцы.

Газета далей указвае, што ўрад узмоцнена рыхтуецца да прадстаячай сесіі парламента, на разгляд якой будуць прадстаўлены велізарны ваенны бюджэт, праекты законаў аб рэформе выбарчай сістэмы і рэформе эканамічнай структуры. У заключэнне газета ўказвае, што Каноэ прадпрыме неабходныя крокі для таго, каб спыніць дэмагогію і крытыку ў адносінах дзейнасці «Асацыяцыі дапамогі трону».



На здымку: Сцэна з 3-га акта «Оптымістычнай трагедыі», пастаўленай Дзяржаўным польскім тэатрам пад мастацкім кіраўніцтвам А. Венгеркі. Фота А. Сапіра

Драмгурток на шклозаводзе

Шклозавод. Вакол распаленай печы мільгаюць чырвоныя кроплі расплаўленага шкла на трубках шклодуваў. Яны, як іскры з-пад гігантскага молата, то паяўляюцца, то зпікаюць. Чоткі рытм працы.

4 гадзіны дня. Канчае работу першая змена. Вось адзін з маладых рабочых, выдуўшы апошнюю бутэльку, сыходзіць з круга. Ён хутка апранаецца і спяшаецца ў клуб, які знаходзіцца ў двары завода.

Заходзім у клуб. На сцэне чакаюць пачатку рэпетыцыі чалавек 10 драмгуртковцаў. Яны не звяжаюць па ходзе і хвалюючыя ў клубе. Ніхто не можа з'явіцца для іх перашкодай. Праз некалькі мінут рэжысёр тав. Сегаловіч пачынае рэпетыцыю. У клубе запаноўвае цішыня. Усе ўдзельнікі занялі свае месцы. Рэпетыруецца трэці акт п'есы А. М. Горкага «Васа Железнова».

Гурток на беластоцкім шклозаводзе арганізаваўся яшчэ ў студзені 1940 года. Калектыў доўга шукаў падыходзячую п'есу, каб падрыхтаваць яе да алімпіяды мастацкай самадзейнасці. Спыніліся на п'есе «Паднятая цаліна» па раману М. Шолахава.

Перад калектывам стаяла цяжкая задача. Людзі не былі знаёмы з калгасным жыццём, з энтузіястамі-будаўнікамі яго. Але ўзяўшыся за справу, яны паспяхова давялі яе да канца. Спектакль «Паднятая цаліна» прадстаў перад камісіяй. Ён быў прызнан лепшым з усіх спектакляў на абласной алімпіядзе і атрымаў першую прэмію.

Пасля алімпіяды Дом Народнай творчасці наладжвае спектаклі «Паднятай цаліны» у тэатры «Палас» для рабочых і служачых прадпрыемстваў Беластока.

Далей драмкалектыў ажыццяўляе пастаноўку двух савецкіх аднаактавых п'ес «На варце» і «На закінутым палустанку». У гэты час з драмгуртковцаў арганізуюцца канцэртныя брыгады. Яны выступаюць на вечарах у сваім клубе, у кінотэатры «Чырвоная зорка», у школах, на 3-м тэкстыльным камбінаце. Зараз яны абслугоўваюць 6-ы выбарчы ўчастак.

У гуртку арганізавана хор, у якое ўваходзяць тт. Кравец, Валендзюк і Міц. Яны выконваюць песні з твораў савецкіх кампазітараў. У час 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча гурток даў канцэрт на выбарчым участку. Выконваліся творы Міцкевіча: «Ода да маладосці», фрагменты з «Пана Тадэуша» і інш. У гэтай канцэртнай брыгадзе удзельнічала 5 чалавек.

Пасля кожнага канцэрта ці спектакля рабочыя прыходзяць за кулісы і цёпла вітаюць сваіх артыстаў, просяць іх часцей наладжваць вечары. У час пастаноўкі першых двух актаў «Васы Железновай» рабочыя шклозавода асаблівы ўдзел выканнні роляў. Яны ўказалі на добра выкананую ролю Васы Вандай Місюнай, а таксама на ролю Людмілы, выкананай Вандай Прокоп.

У драмгуртку 24 чалавекі. Усе яны любяць сваю справу, ахвотна наведваюць рэпетыцыі. Сярод гуртковцаў ёсць сапраўдныя энтузіясты. Тав. Кравец — стаханавец на заводзе. Ён-жа добры грамадзянін. З'яўляючыся намеснікам старшыні акруговай выбарчай камісіі, ён праводзіць вялікую работу на выбарчым участку. На заводзе ён адзін з актыўнейшых драмгуртковаў. Шклодуў тав. Міц добра афармляе дэкарацыі. Усе члены гуртка — рабочыя і служачыя шклозавода.

Зараз калектыў рыхтуецца да ўсесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Два акты «Васы Железновай» ужо гатовы. Артысты добра ведаюць п'есу, ясна прадстаўляюць яе ідэю. Яны многа працуюць над сваімі ролямі.

Кіраўнік гуртка тав. Сегаловіч з'яўляецца рэжысёрам-спецыялістам. Ён скончыў тэатральны інстытут у Варшаве. Рэпетыцыі ў гуртку вядуцца сур'ёзна, удумліва і арганізавана. У гуртку добрая дысцыпліна. Дрэнна толькі тое, што члены драмгуртка працуюць у розны час, таму рэпетыраваць прыходзіцца асобнымі актамі і нават часткамі актаў.

Калектыў спадзяецца ў спаборніцтве гуртоў вобласці выйсці на першае месца.

А. Пакроўскі.

У АБКОМЕ КОМСАМОЛА

Днямі бюро абкома ЛКСМБ заслухала інфармацыю сакратара Сядаўскага райкома комсамола тав. Калабанава аб выкананні пастановы бюро ЦК ВЛКСМ «Аб фізічнай падрыхтоўцы комсамольскага актыва».

Бюро абкома адзначыла, што Сядаўскі райком пагардліва адносіцца да выканання важнейшага рашэння бюро ЦК ВЛКСМ. Комсамольскі актыў раёна не паказвае асабістага прыкладу ў фізічнай падрыхтоўцы. Ні адной нормы на значок ГПА («Гатоў да працы і абароны») не здалі ні комсамольскія актывісты, ні сам сакратар райкома тав. Калабанаў.

Ваенна-фізкультурная камісія райкома бяздзейнічае. У Сядаўскім раёне не створана ні аднаго фізкультурнага калектыва.

Лічачы няправільнай думку тав. Калабанава аб тым, што ў Сядаўскім раёне няма ўмоў для разгортвання фізкультурнай работы і ўстанавіўшы, што комсамольскія кіраўнікі ўсю работу па фізічнаму выхаванню моладзі перакладваюць на фізкультурныя калектывы, а самі стаяць у баку, бюро абкома комсамола вынесла спецыяльную пастанову.

Бюро абкома комсамола абавязала Сядаўскі райком комсамола і ваенна-фізкультурную камісію разам з раённым саветам Асоавіяхіма забяспечыць падрыхтоўку да зімовага спартыўнага сезону. Асаблівую ўвагу звярнуць на развіццё лыжнага спорту, ствараючы ўжо зараз секцыі лыжнікаў. Лічачы, што ў кожным раёне ёсць магчымасці наладзіць выраб лыжаў самімі комсамольцамі і моладдзю, абком рэкамендаваў Сядаўскаму і ўсім гаркомам і райкомам комсамола ўзняць ініцыятыву па выбару лыжаў на месцы ў раёнах кожным комсамольцам і моладдзю.

Усе гаркомы і райкомы комсамола абавязаны не радзей аднаго разу ў месяц практыкаваць правядзенне масавых спартыўных спаборніцтваў, ваенізіраваных лыжных і пешых паходаў, якія адыгрываюць вялікую ролю ў прапагандзе і развіцці фізкультуры сярод моладзі. Паходы і спаборніцтвы трэба старанна рыхтаваць, каб яны выхоўвалі трываласць і смеласць — неад'емныя якасці комсамольца.

—о—

Райком комсамола, які забыў пра фізкультурную работу

У Ломжынскім райкоме комсамола ваенна-фізкультурная камісія пытаннямі фізкультуры зусім не займаецца. Старшыня гэтай камісіі тав. Благаразумаў пры складанні плана работы камісіі не ўключыў ні аднаго пытання аб фізічнай падрыхтоўцы комсамольскага актыва. На пасяджэннях камісія ў большасці выпадкаў рашае толькі пытанні асоавіяхімаўскай работы.

У выніку большасць актывістаў раённай арганізацыі яшчэ не прыступілі да здачы норм на значок «ГПА» («Гатоў да працы і абароны»). Ломжынскі райком комсамола таксама мала ўдзяляе ўвагі пытанням фізічнага выхавання комсамольцаў.

П. Новік.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.